# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Удача будзе спадарожнічаць вам шмат у чым. Некаторыя прадстаўнікі гэтага знака змогуць памяняць месца працы ці сустрэць сваё каханне. Вы адчуеце прыліў сіл і справіцеся з усімі справамі, за якія возьмецеся. Адзінае, ад чаго варта ўстрымацца, дык гэта ад удзелу ў новых праектах. Паспрабуйце прытрымлівацца старых, правераных шляхоў.

**ЦЯЛЕЦ.** Старайцеся не марнаваць каштоўны час, на гэтым тыдні ён будзе на вагу золата. Усё задуманае можа здзейсніцца, калі вы спакойна і старанна будзеце рабіць сваю справу. Перш чым скласці план дзеянняў, варта праверыць надзейнасць тых, каму збіраецеся даверыцца. У другой палове тыдня можаце адчуць, што ў асабістым жыцці наспяваюць праблемы. Паспрабуйце пагаварыць шчыра. Пачуццё такту і спагаднасць дазволяць віртуозна справіцца з пастаўленымі задачамі.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень абяцае быць эмацыянальна насычаным і багатым на падзеі. Вы зможаце дамагчыся мэты, атрымаць прыбытак і здабыць каханне. Фартуна ўсміхнецца ў самы нечаканы момант, а гэта абяцае выкананне даўніх, ужо амаль забытых жаданняў. У чацвер вас чакае гарачае спатканне. У суботу зможаце добра павесяліцца на сяброўскай вечарыныц. Будзьце дабрэйшыя да сваіх блізкіх, пакажыце ім на справе, а не толькі на словах, як вы іх шануеце і любіце.

**РАК.** Тыдзень абяцае нямала прыемных падзей. Аднак ці хопіць у вас на ўсё гэта сіл? Больш адпачывайце, крыху раней кладзіцеся спаць. Магчымы кардынальныя перамены на рабоце, якія падымуць вас на новы прафесійны ўзровень. У сераду варта прызнаць свае памылкі, упартасць паставіць вас у значна больш няёмкае становішча. Нядзеля — удалы дзень, каб завесці хатнюю жывёлу.

**ЛЕЎ.** Нядрэнна было б навесці парадак і ў паперах, і ў галаве, і ў асабістых адносінах. Пажадана захоўваць эмацыянальную раўнавагу і не раздражняцца па дробязях. У аўторак будуць удалыя паездкі і камандзіроўкі, магчыма далёкае падарожжа, якое дазволіць атрымаць поспех у справах або будзе садзейнічаць умацаванню здароўя. У суботу варта схадзіць з сябрамі ў лазню ці хоць бы ў кіно.

**ДЗЕВА.** Панядзелак здзівіць непрадбачанымі паваротамі падзей, якія раскрыюць вашы найлепшыя якасці. У аўторак давядзецца экстранна вырашаць назапашаныя праблемы. Планамерна рухайцеся да мэты, тады яна стане дасягальнай. У пятніцу верагодныя перамены, да якіх вы псіхалагічна не падрыхтаваныя. Аднак панікаваць не варта, справіцеся. У суботу не трэба ператамляцца, адпачывайце, а не спрабуйце перарабіць усе хатнія справы разам.

**ШАЛІ.** На гэтым тыдні жаданне пазбавіцца ад цяжару адказнасці і збегчы ад праблем можа згуляць з вамі злы жарт. Не спяшайцеся завяршаць справы, якія, на вашу думку, ужо блізкія да фіналу. Раптам могуць выявіцца новыя абставіны, якія ў корані зменяць сітуацыю, і ўсё давядзецца перарабляць нанова. Многае будзе залежаць ад начальства і аб'ёму работ. У сярэдзіне тыдня абмяркуйце праблемы з сябрамі.

**СКАРПІЁН.** Тыдзень здабыць унутранай раўнавагі і руху наперад. Не саромейцеся дэманстраваць свае таленты, адзін рашучы і ўпэўнены крок дазволіць дасягнуць мэты і адчуць у сабе магутны ўнутраны энергетычны стрыжань. Будзьце ўважлівыя да блізкіх людзей, у вас ёсць усе шанцы зрабіць адносіны ідэальнымі. Вашы ідэі будуць запатрабаваны ў прафесійнай сферы.

**СТРАЛЕЦ.** Можаце акуратна ўтрымліваць ў кругавароце разнастайных дзелавых і асабістых праблем. Неабходна пераадолець сумненні і няўпэўненасць ва ўласных сілах. У панядзелак пастарайцеся праяўляць практычнасць у справах і размеранасць у жыцці, што прынясе поспех у найбліжэйшай будучыні. Цікавае знаёмства можа спрыяць прафесійнаму поспеху. Чацвер прынясе ўздым сіл, у гэты дзень атрымаецца многае паспець і адчуць задаволенасць ад вынікаў. Субота можа прайсці ў актыўных сяброўскіх зносінах.

**КАЗЯРОГ.** Тыдзень будзе накіраваны на павышэнне прафесійнага ўзроўню і раскрыццё творчага патэнцыялу. У аўторак чакайце ўзнагароджання за вашу настойлівасць і працавітасць. У пятніцу могуць узнікнуць акалічнасці, якія зменяць планы. У нядзелю сваякі нагадаюць пра сябе, паспрабуйце аказаць ім неабходную дапамогу і падтрымку.

**ВАДАЛІЎ.** Вас можа пацягнуць на авантурныя любоўныя прыгоды, толькі не страцьце галавы і не размаўляйце пра асабістыя справы са староннімі. Вас перапаўняюць новыя ідэі і планы, але ўвасобіць іх у рэальнае жыццё будзе няпроста. У сераду можаце прапусціць важныя, але на першы погляд нязначныя дэталі. Засяродзьцеся на рабоце.

**РЫБЫ.** Творчы настрой дазволіць здзівіць свежымі ідэямі сяброў і калег па рабоце. На гэтым тыдні вам больш чым калі-небудзь важна быць самім сабой. Незалежна ад меркавання навакольных неабходна абараніць сваю праўду. Не варта падпадаць пад чужыя чаканні.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.51 | 17.00 | 8.09 |
| Віцебск — | 8.47 | 16.43 | 7.56 |
| Магілёў — | 8.41 | 16.50 | 8.09 |
| Гомель — | 8.31 | 16.54 | 8.23 |
| Гродна — | 9.05 | 17.17 | 8.12 |
| Брэст — | 8.59 | 17.24 | 8.25 |

### Месяц

*Першая квадра 15 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр. Вольгі, Ганны, Дзяніса, Івана, Канстанціна, Мікалая, Міхаіла, Пятра.*
*К. Маргарыты, Клеменса.*



Фота Андрэя САЗОНАВА.

## ЗАЎТРА




**Даты | Падзеі | Людзі**

### 23 ЛІСТАПАДА

**У краіне**

**1893** год — нарадзіўся (вёска Навіны, цяпер у Валожынскім раёне), Радзівон Канстанцінавіч Шукевіч-Траццякоў, дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, журналіст. У 1919—1921 гадах у Чырвонай Арміі: баец, палітработнік, рэдактар газеты «Красноармейская правда». З 1922 года ў Галоўным упраўленні палітыка-асветніцкай работы, старшыня Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і мастацтва Наркамасветы БССР, сакратар Мінскага павятовага камітэта КП(б)Б. З 1924 года рэдактар газеты «Беларуская вёска». У 1931—1936-м супрацоўнік Інстытута філасофіі Беларускай акадэміі навук. У 1938 годзе арыштаваны, у 1940-м асуджаны да пяці гадоў папраўча-працоўных лагераў. Памёр у 1942-м. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1923** год — створана першае беларускае літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». Паўстала з ініцыятывы маладых пісьменнікаў А. Александровіча, А. Бабарэкі, А. Вольнага, А. Дудара, Я. Пушчы, М. Чарота пры падтрымцы партыйных і камсамольскіх органаў, Камісарыята народнай асветы. Цэнтральнымі друкаванымі органамі былі часопіс «Маладняк», многія рэгіянальныя філіялы аддзялення мелі свае выданні. У 1924 годзе на стадыі фарміравання рэгіянальных філіялаў «Маладняк» стаў называцца Усебеларускім аб'яднаннем паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». Меў шматлікія філіялы не толькі ў Беларусі, але і ў Маскве, Ленінградзе, Рызе і Празе. У праграмных дакументах Цэнтральнае Бюро «Маладняка» прымала ідэалогію класавай барацьбы і пабудовы камуністычнага грамадства, абяцала прапагандысцкую падтрымку партыі і камсамолу, выступала за рэалізм у літаратуры, аднак з правам на выкарыстанне мастацкіх дасягненняў. У 1928 годзе рэарганізавана ў Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў.



**1943** год — ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызвалены Брагінскі і Хойніцкі раёны.

**У свеце**

**1898** год — нарадзіўся Радзівон Якаўлевіч Маліноўскі, савецкі военачальнік, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. Удзельнік Першай сусветнай вайны, вайны ў Іспаніі (1936—1939). У Вялікую Айчынную ваяваў на Данскім, Варонежскім, Сталінградскім, Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, 3-м і 2-м Украінскіх франтах. Пасля вайны — камандуючы войскамі Далёкаўсходняй ваеннай акругі. У 1957—1967 гадах быў міністрам абароны СССР. Памёр у 1967 годзе.

**1917** год — УЦВК і СНК прынялі дэкрэт «Аб знішчэнні саслоўяў і грамадзянскіх чыноў», якім скасоўваліся грамадзянскія, ваенныя і прыдворныя чыны, а таксама ордэны, медалі і іншыя знакі адрознення дарэвалюцыйнай Расіі.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Як у вас з кар'ерным ростам?**

**— Усё ў парадку! Я прыйшла на працу паўгода таму простым прадаўцом, а цяпер я ўжо жонка генеральнага дырэктара!**

— Якая розніца для паляўнічага паміж сабакам і лісіцай?

— Прыкладна дзве шкляннкі гарэлкі.

**У пляцінавяроўку падвал з бульбай затапіла кіпнем, і ад прастуды вылечыўся ўвесь дом.**

— Дарагая, а ў цябе ёсць якая-небудзь эратычная фантазія?

— Ёсць.

— Раскажы.

— Я займаюся каханнем пад пальмамі на экзатычным востраве ў трапічную ноч. Побач шуміць мора, на небе велізарныя зоркі, пахне незнаёмымі травамі. Ад віна кружыцца галава...

— А я — я зверху ці знізу?

— А ты дома застаўся.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 22 лістапада 2018 года.